# ВЁСКА, У ЯКОЙ Я ЖЫВУ...

Мне запомніўся момант, калі з'явіўся ў вёсцы першы радыёпрыёмнік. У хату Дзмітрыя Перапечкі, дзе ён быў устаноўлен, набілася поўна калгаснікаў. На іх тварах было напружанне ў чаканні чагосьці надзвычайнага. Каля прыёмніка ўвіхаўся гаспадар дома, штосьці круціў, пераключаў...

Пачуўся трэск, шум, потым загучала песня. Спачатку яе заглушыў шум захаплення. Праз мінуту ўсё сціхла і толькі песня запаўняла памяшканне. Адна з жанчын не вытрымала і, крыху павярнуўшы прыёмнік, зазірнула ўнутр — як гэтая драўляная скрынка можа пець? Ці не схаваўся за ёй хто-небудзь? Паглядзела і ціхенька села на месца пад агульны смех.

А першы трактар? Вакол яго сабралася ўся вёска — і малыя, і старыя. Глядзелі, дзівіліся на машыну, якая можа араць адразу вось такімі вялікімі пяццю плугамі. Мурзаты, у бліскучым ад мазуты камбінезоне, трактарыст ломікам паварочваў махавік. Для нас ён быў як бог: захоча — машына пойдзе ўперад, захоча — узад, управа, улева.

З трубы паказаўся дымок і праз момант трактар загрукатаў. Усе гуртам пабеглі за ім за вёску, дзе ён павінен быў пралажыць першую баразну.

Трактар спыніўся на пашы, па якой яшчэ ні разу не хадзіў плуг. Прычэпшчык сеў на сваё месца, трактар пайшоў. Адразу пяць чорных стужак свежай зямлі пацягнулася за ім.

— Вось дык машына. Усё ёй ніпачым,— бліскаючы вачыма, гаварыў мой сусед Лёня Бондар. — Эх, каб самому...

А трактар усё ішоў і ішоў па кругу, ламаў кусты, вываррочваў карэнні.

Дадому я вяртаўся позна вечарам з бацькам. З дзіцячай непасрэднасцю пытаўся ў яго:

— А ты змог бы купіць трактар?

— Вядома, не. Ён дарагі.

— А наш дзед?

— Дзе там! Ён ледзь трымаў аднаго каня. Усёй зямлі было ў яго некалькі дзесяцін. Толькі з яе мы і жылі, елі, адзяваліся. Было ў яго нас трое сыноў, ды дочкі яшчэ. Вось і раздзялі потым гэтыя дзесяціны на ўсіх — нічога не застанецца. Але адбылася рэвалюцыя, яна нас выратавала ад нястачы і галечы.

— Усе так жылі?

— Не. Недалёка ад нас жыў адзін... Анісім. Дык у яго было каля дзесяці коней, валы, больш дваццаці кароў. І зямлі меў ён многа, уладаў вялікім хутарам...

Доўга я яшчэ слухаў расказ бацькі. Ён назаўсёды ўрэзаўся мне ў памяць і ўсплывае наверх кожны раз, калі хаджу па махнавіцкіх вуліцах.

У цэнтры — клуб, магазін, школа-васьмігодка. Над многімі дахамі — тэлевізійныя антэны. Звычайнай з'явай стала, калі калгаснік едзе на работу на ўласным матацыкле. На машынна-трактарным стане калгаса — больш дзесяці трактароў, пяць камбайнаў, дзевяць аўтамашын і шмат іншай тэхнікі.

Сустрэў аднойчы і Леаніда Бондара, які так захапляўся трактарам. Цяпер ён, закончыўшы політэхнічны інстытут, працуе інжынерам. І, вядома, не ён адзін з вёскі мае дыплом. Валянціна Кулікава таксама інжынер, збіраецца паступаць у аспірантуру, Яўгенія Перапечка — настаўніца, Аркадзій Перапечка — механік, Зоя Ключчановіч — эканаміст...

Сотні гектараў непраходнай багны ператвораны ў зямлю, якая дае высокія ўраджаі жыта і льну, кукурузы і бульбы. У дамах калгаснікаў — дарагія рэчы, наогул — утульнасць і дастатак.

Але лепш усялякіх пералікаў гавораць словы старых калгаснікаў Стахея і Мікалая Перапечак:

— Цудоўна стала жыць. Усё маем, што патрэбна. Дастатак у кожную сям'ю прыйшоў. Вось мы, напрыклад, атрымліваем пенсію. Шкада толькі, што многа гадоў у нас за спіною. Зайздросцім моцна маладым...

І гэта словы людзей, якія многа пражылі і многа бачылі.

Ды і калгас наш называецца «Новы свет». Цудоўная назва. Сапраўды новы свет для сялян адкрыў Вялікі Кастрычнік.

**У. БЫЧЭНЯ.**